**В.Е.Лявончыкаў**, *прафесар*

# ВЫХАВАННЕ ГРАМАДЗЯНСКІХ ЯКАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ АГУЛЬНАПРАФЕСІЙНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

Выхаванне студэнцкай моладзі разглядаецца як адна з трох галоўных задач сістэмы адукацыі (навучанне, выхаванне, развіццё) у педагогіцы. Вылучэнне такога аспекту гэтай праблемы, як выхаванне грамадзянскіх якасцей студэнтаў у працэсе выкладання агульнапрафесійных дысцыплін, не супярэчыць агульнапедагагічнаму і метадалагічнаму патрабаванням. Як вядома, выхаванне студэнтаў можна разглядаць на трох узроўнях: метапрадметным (выхаванне сродкамі ўсіх вучэбных дысцыплін па той ці іншай спецыяльнасці), міжпрадметным (выхаванне ў працэсе выкладання пэўнага цыкла дысцыплін) і прадметным, калі вывучаецца патэнцыял канкрэтнага вучэбнага курса [1, с.7].

Агульнапрафесійныя дысцыпліны, вядома, павінны садзейнічаць прафесійнай кампетэнцыі. Але калі ставіцца мэта сфарміраваць не толькі добрага спецыяліста, але і духоўна багатую асобу пэўнага грамадства, краіны, то і вывучэнне гэтых дысцыплін павінна прадугледжваць усебаковае выхаванне студэнтаў, у тым ліку выхаванне ў іх грамадзянскіх якасцей.

Выхаванне як пэўная сістэма ўключае наступныя кампаненты: кіраванне, змест, арганізацыю, зносіны. Кіраванне ў дадзеным выпадку азначае майстэрства педагогаў ставіць мэты, фармуляваць прынцыпы, шляхі іх дасягнення, праводзіць кантроль і ацэнку вынікаў. Арыенцірам для выкладчыкаў у рэалізацыі першага кампанента з'яўляецца канцэпцыя выхавання дзяцей і моладзі, якая распрацавана ў Рэспубліцы Беларусь (Мн., 2001) з улікам стану выхаваўчай работы на сучасным этапе. Асноўная мэта выхавання, вызначаная ў гэтай канцэпцыі, – фарміраванне спецыяліста, духоўна і маральна сталай творчай асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такая мэта патрабуе выхавання студэнта, якому ўласцівы якасці грамадзяніна, патрыёта, працаўніка і сем'яніна [2, с. 137]. Спецыфічнымі мэтамі выхавання з улікам разглядаемага намі аспекту з'яўляецца фарміраванне свядомага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, характэрнымі рысамі якога павінны быць усведамленне абавязкаў перад Радзімай, грамадствам, сям'ёй, уважлівыя адносіны да Радзімы, яе гісторыі, органаў дзяржаўнай улады, грамадзянскіх і грамадскіх інстытутаў, сацыяльных і нацыянальных груп насельніцтва; прававая эрудыцыя і законапаслухмянасць; патрыятызм; этыка грамадзянскіх і працоўных узаемаадносін; сацыяльная актыўнасць.

Пры выхаванні грамадзянскіх якасцей, на наш погляд, можна кіравацца мэтасістэмнымі прынцыпамі, вызначанымі ў вышэйназванай канцэпцыі, менавіта прынцыпамі навуковасці, прыродаадпаведнасці, культураадпаведнасці, негвалтоўнасці і талерантнасці, сувязі выхавання з жыццём, адкрытасці, варыятыўнай дзейнасці, эстэтызацыі студэнцкай жыццядзейнасці.

Рэалізацыя эмерджэтных і спецыфічных мэт выхавання студэнтаў на падставе названых прынцыпаў здзяйсняецца ў працэсе вывучэння сацыяльна-гуманітарных, агульнанавуковых і агульнапрафесійных, спецыяльных дысцыплін. Кожная з дысцыплін мае свае асаблівасці. Калі формы арганізацыі і метады іх навучання маюць невялікія адрозненні, то змест прадметаў, а значыць, веды, уменні, навыкі, спосабы дзейнасці значна адрозніваюцца.

Змест агульнапрафесійных дысцыплін аб'ектыўна дазваляе студэнтам засвоіць рэальныя аб'екты, працэсы, тэхналогіі, набыць уменні і навыкі ў будучай дзейнасці, а таксама выявіць і развіць асабістыя адносіны да гэтых аб'ектаў і ведаў аб іх.

Змест агульнарафесійных дысцыплін па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" вызначаны ў адпаведным дзяржаўным адукацыйным стандарце. Калі яго аналізаваць з пункту гледжання вызначанай намі праблемы, то можна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канстатаваць, што ў ім прадугледжаны засваенне студэнтамі ролі, функцый і задач інфармацыі, кнігі, дакумента, інфармацыйных рэсурсаў у жыцці грамадства; місія (функцыі і спецыяльныя задачы) розных відаў і тыпаў бібліятэк адносна грамадства, асобных яго груп і індывідаў; нарматыўна-прававыя акты Рэспублікі Беларусь, у якіх указаны правы і абавязкі грамадзян краіны пры стварэнні, распаўсюджванні і выкарыстанні інфармацыі. У прыватнасці, больш падрабязна разглядаецца артыкул 4 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, які адносіцца да права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне інфармацыі. Асаблівая ўвага надаецца аналізу законаў Рэспублікі Беларусь аб аўтарскім праве і сумежных правах, навуковай дзейнасці, друку і іншым сродкам масавай інфармацыі, рэкламе, электронным дакументам, інфарматызацыі, навукова-тэхнічнай інфармацыі. Больш пашырана разглядаецца закон "Аб бібліятэчнай справе", які вызначае прававыя, эканамічныя, сацыяльныя аспекты бібліятэчнай дзейнасці, гарантуе права кожнага грамадзяніна на свабодны доступ да бібліятэчна-інфармацыйных рэсурсаў.

Разглядаючы заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у сістэме дакументных камунікацый, у якіх прадугледжаны правы і пэўныя абмежаванні на вытворчасць, распаўсюджванне і выкарыстанне інфармацыі, выкладчыкі падкрэсліваюць аб'ектыўны характар такіх абмежаванняў, бо магчымасці сучасных інфармацыйных тэхналогій могуць "стварыць новыя пагрозы грамадству, дзяржаве, канкрэтнаму чалавеку – пагрозы іх інфармацыйнай бяспецы".

Выхаваўчае навучанне, як вядома, уключае ў першую чаргу ўзаемадзеянне выкладчыка са студэнтамі, зносіны, якія падраздзяляюцца на дзве формы: маналагічную, здзяйсняльную на лекцыях, і дыялагічную, рэалізуемую ў працэсе правядзення практычных заняткаў (семінараў, лабараторных работ, практыкаванняў). Пошук больш эфектыўных варыянтаў правядзення лекцыйных заняткаў, якія б уплывалі на развіццё творчых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

здольнасцей студэнтаў, а не толькі на ўспрыманне і запамінанне імі інфармацыі, прывялі да ўзнікнення новых лекцыйных формаў, такіх яе праблемныя лекцыі, лекцыя-візуалізацыя, лекцыя-прэс-канферэнцыя. Аднак і яны прадугледжваюць галоўным чынам маналагічнае ўзаемадзеянне са студэнтамі. Таму зараз ёсць спробы з боку айчынных і замежных педагогаў праводзіць так званае змешанае (маналагічнае і дыялагічнае) уземадзеянне ў час чытання лекцый. Да такіх формаў лекцый адосяцца лекцыя з удзелам студэнтаў; міні-лекцыя; лекцыя з працэдурай паўз.

Якія б метады мы ні ўжывалі ў маналагічных формах навучання, яны не даюць магчымасці ў поўным аб'ёме сфарміраваць сацыяльна-грамадзянскую кампетэнцыю студэнтаў, бо апошняя, акрамя ведаў, уменняў, навыкаў, спосабаў дзейнасці, прадугледжвае далучэнне да каштоўнасцей, якія можна сфарміраваць толькі ў працэсе дыялагічна-дыскусійных формаў і зносін выкладчыкаў і студэнтаў у час правядзення семінарскіх, лабараторных і іншых відаў заняткаў. У практыцы навучання і выхавання існуюць розныя формы дыялагічна-дыскусійных зносін: групавая дыскусія, панель-дыскусія, круглы стол, пытанні і адказы, прэс-канферэнцыя, адкрытая кафедра і аўкцыён ідэй, адкрыты мікрафон і інш.[3]. Каля ста такіх формаў работы з моладдзю прапаноўваюць В.В.Арцёменка і Ж.Я.Завадская ў сваёй працы "Формы выхаваўчай работы з моладдзю. Арганізацыя і методыка правядзення"[4].

Да метадаў выхавання ўвогуле, у тым ліку грамадзянскіх якасцей, у педагогіцы адносяць уздзеянне і перакананне, тлумачэнне, патрабаванне, заахвочванне, пакаранне, прывучванне, успрыманне пачуццём і інш.

Да якіх жа каштоўнасцей трэба далучыць студэнтаў, каб яны авалодалі грамадзянскімі якасцямі? Мы ў дадзеным выпадку згодны з доктарам філасофскіх навук, прафесарам М.І.Латышам, які падкрэсліваў, што нацыянальны стрыжань павінен "дапамагчы чалавеку раскрыць свае сілы і здольнасці,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

акультурыць яго пачуцці і мысленне, стварыць цэласны гарманічны ўнутраны свет, дапамагчы стаць свядомым і адказным грамадзянінам сваёй Радзімы, паўнацэнным прадстаўніком чалавецтва” [5]. Гэта не значыць, што ў працэсе навучання мы павінны абмяжоўвацца толькі нацыянальнымі каштоўнасцямі. Вышэйшая адукацыя садзейнічае авалоданню студэнтамі дасягненнямі і сусветнай культуры.

Гэта задача ў працэсе выкладання агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін патрабуе далучэння студэнтаў, з аднаго боку, да каштоўнасцей у галіне кніжнай, бібліятэчнай і бібліяграфічнай справы Беларусі, навучанне іх спосабам дзейнасці, звязаным з захаваннем, зберажэннем і распаўсюджваннем нацыянальна-культуранй спадчыны грамадзян Беларусі, з другога – далучэння іх да адпаведных сусветных каштоўнасцей іншых краін.

Правядзенне дыялагічна-дыскусійных формаў заняткаў патрабуе ад выкладчыка валодання камунікатыўнай культурай.

У педагогіцы вышэйшай школы пры вывучэнні праблемы выхавання праз вучэбны працэс пачалі ўжываць паняцці “выхаваўчае навучанне”, “пераканаўчае навучанне”. Распрацаваны патрабаванні да такога навучання. “Каб навучанне было выхаваўчым, – сцвярджае доктар педагагічных навук Ю.Г.Фокін, – яно павінна быць пераканаўчым, патрэбна не проста паведамляць інфармацыю, але і пацвердзіць яе фактамі, вопытам (магчыма, і ў лабараторным практыкуме), суаднесці з альтэрнатыўнымі падыходамі, засведчыць моцныя і слабыя бакі” [1, с.154].

Асноўнай мэтай выхаваўчага працэсу з’яўляецца арыентацыя асобы на самавыхаванне, самаразвіццё, самарэалізацыю. Рэалізацыя гэтай мэты патрабуе ўключэння студэнтаў у розныя віды дзейнасці, якія з’яўляюцца сродкамі выхавання і ўмовай самарэалізацыі чалавека. Па агульным прызнанні як тэарэтыкаў, так і практыкаў адукацыі, студэнты пачынаюць адчуваць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сябе гаспадарамі жыцця толькі тады, калі іх пачынаюць уключаць у сацыяльную дзейнасць.

Разгледжаныя формы і метады выхавання грамадзянскіх якасцей даюць магчымасць зрабіць выснову, што ў працэсе выкладання агульнапрафесійных дысцыплін можна сфарміраваць якасці грамадзяніна, які будзе актыўна і кампетэнтна ў сваёй прафесійнай дзейнасці садзейнічаць развіццю грамадства і дзяржавы.


1. *Фокин Ю.Г.* Преподавание и воспитание в высшей школе. Методология, цели и содержание, творчество: учеб. пособие для студентов высших учебных заведений. – М., 2002. – 224 с.

2. *Жук А.И.* Основы педагогики: учеб. пособие / А.И.Жук, И.И.Казимирская, О.Л.Жук, Е.А.Коновальчик. – Мн., 2003. – С.349.

3. *Савченко С.А.* Коммуникативная культура в педагогике специалиста-педагога // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – №1. – С.33–38.

4. *Артеменко В.В., Завадская Ж.Е.* Формы воспитательной работы с молодежью. Организация и методика проведения. – Мн., 1994. – 230 с.

5. *Латыш М.І.* На шляху да "адукацыйнага грамадства": сем нарысаў пра адукацыю. – Мн., 1997. – С.64.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ